АРК

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 4(50) 2006**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік

Весці БДПУ №4(50) сер 2.

### Гісторыя

*Бушчык Г. П.* Унутрысаюзныя сувязі БССР па ўвозе і вывазе прамысловай прадукцыі ў 70—80-я гг. XX ст. .......... 3

*Барабаш Н. В.* Віды і формы міграцыйных працэсаў у БССР у першыя пасляваенныя гады (1945—1950-я гг.) .......... 9

*Якаўчук В. І.* Аднаўленне і развіццё пажарнага добраахвотніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады (1944—1957 гг.) .......... 12

*Юрчак Дз. В.* Беларуска-ўкраінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991—2004 гг. .......... 15

*Пуцік У. С.* Падзенне ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльнай сферы і рост яе палітычнай актыўнасці ў Беларусі ў пачатку XX ст. .......... 19

*Дрывень І. І.* Дзейнасць франтавых камітэтаў УЗС і УСГ па аказанні дапамогі арміі і насельніцтву .......... 23

*Шкуцько Л. Л., Драздова К. А.* Станаўленне капіталістычных банкаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX — пачатку XX ст. .......... 27

*Пракаповіч Л. Э.* Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. .......... 31

*Сянькевіч А. І.* Барацьба са злачыннасцю падлеткаў у канцы XIX — пачатку XX стст. і яе сувязь са станаўленнем заканадаўства аб ахове правоў дзіцяці .......... 35

*Доўнар Л. А.* Крэдытная палітыка савецкай дзяржавы адносна прыватнай вытворчасці ў Беларусі перыяду НЭПа .......... 38

*Крывіцкі Д. С.* Дыскрэдытацыя партызанскага руху ў Беларусі германскімі спецслужбамі: лжэпартызанскія атрады .......... 43

*Вінніца Г. Р.* Выратаванне яўрэяў Праведнікамі на акупіраванай тэрыторыі Усходняй Беларусі .......... 46

*Старычонак В. В.* Эвалюцыя амерыканскай грамадскай думкі па пытанні аб пачатку вайны супраць Ірака (жнівень 1990 — студзень 1991 г.) .......... 49

*Варывончык І. В.* «Неакансерватыўная рэвалюцыя» Рональда Рэйгана .......... 54

*Цзян-Шу-і.* Праблема Тайваня ў савецка-кітайскіх адносінах (другая палова 40-х — 50-я гг. XX ст.) .......... 58

### ...асофія

*...сюк У. Ф.* Феномен чалавека: адзінства цэласнасці ...чнасці .......... 63

*...яцюк В. В.* Беларускі менталітэт як аснова грамадзянскай ...дамасці .......... 67

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАЛІТАЛОГІЯ

УДК 32.001 (47+476)

*В. А. Зенчанка*

## СТАНАЎЛЕННЕ ГРАМАДЗЯНСКАГА ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ І РАСІІ: АГУЛЬНАЕ І АСАБЛІВАЕ

На сучасным этапе маладым суверэнным рэспублікам былога СССР, у тым ліку Беларусі і Расіі, прыходзіцца вырашаць цяжкія і складаныя задачы мадэрнізацыі грамадства. Таму неабходна далейшае асэнсаванне сутнасці, гісторыі, умоў і шляхоў фарміравання грамадзянскага грамадства, якое ўяўляе аснову стабільнасці дзяржавы і палітычнай сістэмы ў цэлым. Фарміраванне развітога грамадзянскага грамадства з'яўляецца не толькі важнай перадумовай стабільнасці і эфектыўнасці палітычнай сістэмы, але і адлюстроўвае асноўныя параметры сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў постсавецкіх дзяржаў, працэс іх руху на шляху дэмакратызацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця.

Даследуючы праблему станаўлення грамадзянскага грамадства ў сучаснай Беларусі і Расіі, уяўляецца метадалагічна апраўданым пачаць яе аналіз з агульнасці гістарычнага лёсу беларускага і расійскага народаў, тыпаў нацыянальнай, палітычнай і грамадзянскай культур, у многіх вызначаючых спецыфіку гэтага працэсу.

Цікавасць да палітычнай і грамадзянскай культуры ў нашых краінах, якая ўзнікла ў апошняе дзесяцігоддзе, тлумачыцца імкненнем зразумець працэсы трансфармацыі, якія адбываюцца ва ўсходне-еўрапейскіх краінах, перспектывы іх далейшага развіцця. Вытокі палітычнай і грамадзянскай культуры любога грамадства караняцца ў асаблівасцях яго геапалітычнага становішча, цывілізацыйнага і этнанацыянальнага развіцця. У сувязі з гэтым можна вылучыць некалькі найбольш важных агульных фактараў, якія дзейсна ўплываюць на фарміраванне якасных параметраў палітычнай і грамадзянскай культуры беларускага і расійскага грамадства.

Па-першае, асаблівае геапалітычнае становішча Беларусі і Расіі на восі Усход — Захад. Яно абумовіла непасрэднае ўзаемадзеянне і проціборства розных культур, традыцый, рэлігій, дзяржаўных імкненняў, што прыводзіла да размытасці межаў паміж нацыянальнымі, канфесіянальнымі і культурнымі супольнасцямі, накладвання розных культурных плыняў з Усходу і Захаду.

Па-другое, для нашых народаў характэрна панаванне на працягу доўгага часу абшчынных, калектыўных пачаткаў ладу жыцця, прынцыпу групавой справядлівасці над прынцыпам індывідуальнай свабоды і самавызначэння, характэрнага для заходняй цывілізацыі. Такое становішча было выклікана экстрэмальнымі ўмовамі існавання ў зоне рызыкоўнага земляробства, захаваннем сельскай абшчыны, якую не змагла разбурыць да канца сталыпінская аграрная рэформа. Як вядома, у краінах Заходняй Еўропы разлажэнне сельскай абшчыны адбылося значна раней, а ў ЗША яе наогул не было.

Па-трэцяе, пры аналізе праблемы станаўлення грамадзянскага грамадства ў Беларусі і Расіі патрэбна звярнуць увагу на спецыфіку ўзаемадзеяння трох найважнейшых кампанентаў чалавечага жыцця: дзяржава — грамадства — асоба, традыцый адносін да ўлады.

З канца XVIII ст. у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Расійскай імперыі і адпаведна ў логіку расійскай палітычнай гісторыі. На працягу стагоддзяў у выніку пэўных гістарычных прычын моцная дзяржаўная ўлада ў Расіі была асновай сацыяльнага парадку, адыгрывала ролю абаронцы і гаранта стабільнасці. Доўгае панаванне аўтарытарных і таталітарных рэжымаў, перааддоленне дзяржаўных форм рэгулявання грамадскага жыцця прыводзілі да абмежавання індывідуальнай свабоды, ініцыятывы і прадпрымальнасці ў розных сферах, зніжэння пачуцця асабістай адказнасці і самастойнасці, фарміравання арыентацыі на патэрналісцкую дзяржаву і харызматычнага лідэра.

Кароткі экскурс у гісторыю дазваляе лепш зразумець агульныя праблемы, цяжкасці, супярэчнасці і тэндэнцыі працэсу фарміравання грамадзянскага грамадства ў Беларусі і Расіі ў сучасных умовах. Ён дае магчымасць усвядоміць адрозненні яго станаўлення ад Захаду,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бо грамадзянскае грамадства — гэта ў першую чаргу прадукт заходняй цывілізацыі, арганічна ўласцівы ёй. Яго паспяховае функцыяніраванне прадугледжвае наяўнасць пэўнага тыпу чалавека, які сфарміраваўся ў яе лоне і валодае характэрнымі якасцямі: практыцызмам, дзелавітасцю, здольнасцю да канкурэнтнай барацьбы, вынаходлівасцю, павышаным пачуццём уласнай годнасці, імкненнем да незалежнасці і поспеху ў справе, здольнасцю да самадысцыпліны і самаарганізацыі, схільнасцю да індывідуалізму [1, 49—50]. Як адзначалася, тып асобы, што склаўся ў межах усходнеславянскай цывілізацыі, у выніку гістарычных прычын па многіх параметрах адрозніваецца ад заходняга чалавека. Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што шляхі фарміравання грамадзянскага грамадства ва ўсходнеславянскіх краінах, інстытуты і механізмы яго функцыяніравання і ўзаемадзеяння з дзяржавай пры ўсёй універсальнасці сутнасных характарыстык і параметраў дадзенага феномена, безумоўна, будуць мець спецыфічныя нацыянальныя асаблівасці.

Пры разглядзе праблемы станаўлення грамадзянскага грамадства ў Беларусі і Расіі, патрэбна адзначыць, што прынцыповае значэнне маюць пытанні аб змесце працэсу яго фарміравання і аб базісных элементах дадзенага працэсу. У сувязі з гэтым з'яўляецца аб'ектыўная неабходнасць у аналізе асноўных базісных элементаў грамадзянскага грамадства і ступені іх сфарміраванасці ў нашых краінах. Да такіх можна аднесці наступныя:

1) фарміраванне і развіццё новых эканамічных адносін, у аснове якіх ляжыць шматукладная рыначная эканоміка;
2) наяўнасць у грамадстве развітой, разнастайнай сацыяльнай структуры, якая адлюстроўвае багацце і ўсебаковасць інтарэсаў розных груп і слаёў;
3) узнікненне шматлікіх форм працоўных асацыяцый, сацыяльных, рэлігійных і культурных аб'яднанняў, самадзейных арганізацый, грамадска-палітычных рухаў, партый, што складаюць галоўныя інстытуты грамадзянскага грамадства і асяроддзе для раскрыцця сацыяльнай актыўнасці грамадзян;
4) законазабяспечанасць насельніцтва: фарміраванне эфектыўнай прававой дзяржавы, забеспячэнне вяршэнства закона ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, захаванне правоў чалавека;
5) фарміраванне і разгортванне механізмаў самарэгуляцыі і самакіравання на ўсіх узроўнях грамадскай сістэмы.

Прааналізуем наяўнасць, спецыфіку і ступень развітасці названых базісных элементаў грамадзянскага грамадства ў адносінах да Беларусі і Расіі ў тым парадку, у якім яны пералічаны.

1. Пасля распаду СССР у пачатку 90-х гг. пераход да рыначнай эканомікі і ў Беларусі, і ў Расіі ў асноўным меў ідэнтычныя рысы. Ён характарызаваўся рэзкім скарачэннем эканамічных сувязей з былымі савецкімі рэспублікамі, стыхійнай прыватызацыяй, лібералізацыяй цэн і знешнеэканамічных сувязей, празаходняй арыентацыяй.

Аднак з выбраннем у 1994 г. А. Р. Лукашэнкі прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у курс сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны былі ўнесены істотныя карэктывы, што дазволіла гаварыць аб фарміраванні асаблівай беларускай эканамічнай мадэлі. Гэта мадэль характарызуецца паступовасцю і прадуманасцю рэформ, захаваннем рэгулюючай ролі дзяржавы сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, адмаўленнем ад прыватызацыі асноўных галін эканомікі, устаноўкай на яе сацыяльную арыентацыю і падтрымку сельскай гаспадаркі.

У адрозненне ад Беларусі ў Расійскай Федэрацыі да нядаўняга часу праводзілася палітыка «шокавай тэрапіі», масавая прыватызацыя рэнтабельных прадпрыемстваў, стаўка на вольны рынак. І толькі ў апошнія некалькі гадоў намеціўся крэн у бок узмацнення рэгулюючай ролі дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай сферы, абмежавання ўсяўладдзя алігархаў, якія ў сучаснай Расіі кантралююць каля чвэрці ўсіх фінансавых рэсурсаў.

Такім чынам, за перыяд рэфармавання эканомікі ў Беларусі і Расіі ўзніклі і сфарміраваліся розныя формы ўласнасці: індывідуальная, прыватная, акцыянерная, кааператыўная, змешаная і інш. У той жа час у нашай краіне дзяржава захоўвае вядучыя пазіцыі ў асноўных галінах народнай гаспадаркі і забяспечвае сацыяльную накіраванасць развіцця эканомікі ў інтарэсах усяго народа, тады як у Расіі каля 70% прадпрыемстваў знаходзіцца ў руках прыватнага бізнесу, які часта не ўлічвае інтарэсы людзей працы і самой дзяржавы.

2. Пад уплывам эканамічных пераўтварэнняў, фарміравання змешанай шматукладнай рыначнай эканомікі істотныя змены адбываюцца ў сацыяльнай структуры беларускага і расійскага грамадства. Значныя трансфармацыі зведваюць традыцыйныя класы савецкага грамадства. Рабочы клас страчвае сваю былую ролю і пазіцыі, пераўтвараецца ў клас наёмных работнікаў (у расійскай Федэрацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асобы наёмнай працы сярод занятага насельніцтва складаюць 93%), распадаецца на розныя слаі з рознымі інтарэсамі ў сувязі з фарміраваннем шматукладнай эканомікі. Моладзь не асабліва імкнецца ў масавую вытворчасць, бо статус і прэстыж рабочага чалавека значна знізіўся ў яе вачах.

Сялянства таксама перажывае няпростыя часы, у прыватнасці, склаўся дыспарытэт цэн паміж сельскагаспадарчай прадукцыяй і прамысловай не на карысць першай. Многія гаспадаркі не змаглі прыстасавацца да рыначных умоў і аказаліся на мяжы разарэння. Рэзка паменшыліся даходы жыхароў вёскі, пагоршылася іх сацыяльна-эканамічнае становішча. Фермерства пакуль яшчэ вельмі нешматлікае і мае тэндэнцыю да памяншэння. Так, у Рэспубліцы Беларусь з сярэдзіны 90-х гг. колькасць фермерскіх гаспадарак зменшылася з 5 тыс. да 3 тыс. у наш час, у Расійскай Федэрацыі за той жа перыяд — з 300 тыс. да 100 тыс. Найбольш востра стаіць праблема скарачэння занятых у сельскай гаспадарцы (у Беларусі з 19,1% у 1995 г. да 12,1% у 2002 г.). Адпаведная тэндэнцыя наглядаецца і ў Расіі, што звязана з збядненнем дэмаграфічнай базы вёскі і міграцыяй моладзі ў горад.

Вядома, што сацыяльнай асновай грамадзянскага грамадства з'яўляецца сярэдні клас, які выконвае ў наш час функцыю сацыяльнага і палітычнага балансёра, выступае гарантам грамадскай стабільнасці і згоды, прыдае ўстойлівасць грамадзянскім адносінам, прымушае да мадэрнізацыі дзяржавы і грамадства. Практычна ва ўсіх развітых краінах сярэдні клас складае 55—60%. Аднак яго фарміраванне ў нашай рэспубліцы і ў Расіі адбываецца вельмі маруднымі тэмпамі ў выніку шэрага прычын. Так, калі ў савецкі перыяд да сярэдняга класа адносілася 60—70% насельніцтва, то ў працэсе складанай і супярэчлівай трансфармацыі грамадства яго частка зменшылася ў некалькі разоў. Сёння найбольш важнай характарыстыкай сацыяльнай структуры грамадства з'яўляецца яго палярызацыя, расслаенне на бедных і багатых. І калі ў Беларусі, дзякуючы актыўнай сацыяльнай палітыцы дзяржавы, удалося мінімізіраваць вынікі гэтага працэсу, то ў Расійскай Федэрацыі дадзеная праблема стаіць даволі востра і садзейнічае ўзмацненню сацыяльна-палітычнай напружанасці ў краіне. Так, у 1994 г. суадносіны грашовых даходаў 10% самых багатых і 10% самых бедных расіян склалі 1: 9, а ўжо ў першым квартале 1995 г. — амаль 1 : 15. Аднак гэтыя лічбы не ўлічваюць тыя 5% звышбагатага насельніцтва, даных аб якіх статыстыка не мае [2, с. 115]. Становішча ў гэтай сферы мала змянілася і на сучасным этапе развіцця расійскага грамадства. Статыстычныя органы Расійскай Федэрацыі даюць наступныя даныя: каля 10% — ніжэйшыя слаі, якія знаходзяцца за рысай беднасці, прыкладна 70% — бедныя і малазабяспечаныя, каля 20% — сярэднезабяспечаныя і 2% звышбагатыя, звязаныя перш за ўсе з нафтагазавай галіной [3, с. 38].

Такім чынам, узмацненне сацыяльна-эканамічнай дыферэнцыяцыі пры пераходзе да рыначнай эканомікі — аб'ектыўны працэс. Аднак для недапушчэння сацыяльнай напружанасці і канфліктаў у дадзенай сітуацыі патрабуецца правядзенне моцнай сацыяльнай палітыкі, пошуку грамадзянскай згоды, якая з'яўляецца галоўнай умовай нармальнага функцыяніравання новай сістэмы і паспяховага фарміравання грамадзянскага грамадства. У гэтым плане наша рэспубліка выглядае лепш за Расію. Аднак варта адзначыць, што станаўленне дзяржавах развітой і разнастайнай сацыяльнай структуры, усведамленне сацыяльнымі слаямі і групамі сваіх рэальных інтарэсаў знаходзіцца ў дадзены момант у пачатковай стадыі.

3. За перыяд дэмакратызацыі ў Беларусі і Расіі з'явіліся сотні грамадскіх аб'яднанняў (маладзёжных, жаночых, прафсаюзных, нацыянальных, ветэранскіх і інш.). Таму пачалося фарміраванне шматпартыйнай сістэмы, якая выступае адным з важных элементаў і ўмоў развіцця грамадзянскага грамадства ў палітычнай сферы, што забяспечвае існаванне і канкурэнцыю розных партый, ідэй і поглядаў. У наш час у Рэспубліцы Беларусь існуе 17 палітычных партый, ў Расійскай Федэрацыі — каля 50 (больш дакладную лічбу назваць цяжка, бо колькасць партый у Расіі кожны год мяняецца). Ідэйна-палітычны спектр партый саюзных дзяржаў даволі шырокі і з цяжкасцю паддаецца класіфікацыі, хоць некаторыя яе кірункі ўжо абазначыліся дастаткова выразна. Можна канстатаваць, што партыйныя сістэмы ў Беларусі і Расіі знаходзяцца ў стадыі станаўлення і афармлення. Для іх характэрны такія асаблівасці, як няўстойлівасць, змена партый, спантаннае з'яўленне новых, знікненне, занепад раней узнікшых, трансфармацыя дзеючых партый. Таму большасць партый пакуль не карыстаецца шырокім даверам сярод насельніцтва і не можа ў поўнай ступені ажыццяўляць функцыю пасрэдніка ў сістэме «грамадства—дзяржава».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шырокі спектр грамадска-палітычных поглядаў прадстаўлены ў Беларусі 2234 грамадскімі аб'яднаннямі: маладзежнымі, спартыўнымі, ветэранскімі, навуковымі, прафесійнымі, спартыўнымі і інш. Усе больш выразнае афармленне атрымліваюць грамадскія рухі: за мір, захаванне гістарычных помнікаў, традыцый і культуры, абарону навакольнага асяроддзя і г. д.

4. Грамадзянскае грамадства — гэта грамадства дэмакратычнае, прававое. Па меркаванні вядомага нямецкага палітолага Р. Дарэндорфа, грамадзянскае грамадства — агульны паказальнік сапраўднай дэмакратыі і эфектыўнай рыначнай эканомікі [4, с. 73]. Рух да грамадзянскага грамадства ёсць рух да больш поўнага ажыццяўлення прававых норм свабоды, роўнасці грамадзян. За гады суверэнітэту ў Беларусі і Расіі створана значная заканадаўчая база. Дастаткова адзначыць, што толькі кодэксаў у Рэспубліцы Беларусь прынята 22. Большая частка прававых актаў накіравана на забеспячэнне канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, абарону такіх каштоўнасцей, як уласнасць, бяспека, грамадзянская згода, правы на свабоду слова, друку і інфармацыі, прадастаўлення магчымасці ствараць палітычныя партыі і іншыя грамадзянскія аб'яднанні, якія садзейнічаюць выяўленню і выражэнню палітычнай волі грамадзян і г. д. Разам з тым неабходна далейшая плённая праца ў гэтым кірунку і стварэнне эфектыўных механізмаў па рэалізацыі законаў. Асабліва гэта тычыцца Расіі, дзе высокі ўзровень карупцыі, усеўладдзя фінансавай алігархіі, недастаткова ўлічваюцца і абараняюцца інтарэсы значнай часткі насельніцтва.

5. Пытанне практычнага ўвасаблення канстытуцыйнага палажэння аб тым, што народ з'яўляецца крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў краіне, патрабуе ў цяперашніх умовах фарміравання і далейшага разгортвання механізмаў сацыяльнай самарэгуляцыі і самакіравання на ўсіх узроўнях грамадскай сістэмы, што выступае важнай умовай станаўлення паўнацэннага грамадзянскага грамадства. У наш час падыход да гэтай праблемы ў Расіі і Беларусі ў выніку аб'ектыўных прычын значна адрозніваецца. Калі ў нашай рэспубліцы актыўна распрацоўваецца канцэпцыя рэфармавання і развіцця сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання, пэўнай дэцэнтралізацыі дзяржаўнай улады, то ў Расіі, наадварот, наглядаецца працэс яе ўзмацнення і цэнтралізацыі з мэтай пераадолення цэнтрабежных тэндэнцый і забеспячэння стабільнасці і парадку ў грамадстве.

У выніку неабходна адзначыць, што працэс станаўлення грамадзянскага грамадства ў Беларусі і Расіі мае як агульныя рысы, так і значныя адрозненні. Аднак у дзяржавах ён носіць складаны і супярэчлівы характар, у той жа час — паступовы, паслядоўны і незваротны.

*Літаратура*
1. *Зиновьев, А.* Запад / А. Зиновьев. — М., 2000. — 509 с.
2. *Волков, Ю. Г.* Социология / Ю. Г. Волков. — М., 2003. — 253 с.
3. *Глебова, И. И.* Политическая культура современной Росии: облики новой русской власти и социальные расколы / И. И. Глебова // Полис. — 2006. — № 1. — С. 11.
4. *Дарендорф, Р.* Дорога к свободе: демократизация и ее проблемы в Восточной Европе / Р. Дарендорф // Вопросы философии. — 1990. — № 9. — С. 6.

*Summary*
*In this article the comparative analysis of making principal institutions of a civil society in Belarus and Russia is given, difficulties and antagonisms of this process are considered.*

*УДК 32.001*

***Дз. І. Навумаў, А. А. Крошка***

# РОЛЯ ПАЛІТЫКА-КУЛЬТУРНАГА ФАКТАРУ Ў ТРАНСФАРМАЦЫІ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРАДКУ Ў ГРАМАДСТВЕ ПЕРАХОДНАГА ТЫПУ

Параметры і перспектывы развіцця сучаснага беларускага грамадства ў многім абумоўліваюцца нацыянальнай палітычнай культурай, якая імпліцытна выступае ў якасці своеасаблівай нарматыўна-каштоўнаснай матрыцы для разнародных сацыятальных працэсаў. Адным з такіх выступае працэс селекцыі і/ці мадэрнізацыі сацыяльных інстытутаў, якія дэтэрмінуецца глабалізацыйным кантэкстам.

Даследчая цікавасць менавіта да праблематыкі трансфармацыі прававых адносін у грамадстве пераходнага тыпу абумоўлена задачамі і логікай пабудовы як новага сацы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ